УДК 811.161.3’373.21(476)

# Сучасны стан беларускай тапанімікі

**Мезенка Г.М.**
***Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава», Віцебск***

*Як вядома, “навуковы перыяд тапанімікі, як і анамастыкі ўвогуле, у Беларусі пачаўся напрыканцы XIX ст.”. Першыя лінгвістычныя даследаванні беларускай тапанімікі з’явіліся ў 1890-х гг. Ля вытокаў тапанімікі ў Беларусі стаяць такія вядомыя даследчыкі, як А.А. Качубінскі, Ю.Ю. Трусман, Я.Ф. Карскі [1]. З 1946–1947 гадамі звязваюць пачатак сістэматычнага вывучэння тапаніміі Беларусі (прыгадаем працы М.Я. Грынблата, П.П. Шубы, В.А. Жучкевіча, Л.А. Акаловіча).*

*Значная актывізацыя тапанімічных даследаванняў адзначаецца ў 1960–1980-х гг. і звязана яна з дзейнасцю такіх выдатных беларускіх тапаністаў, як М.В. Бірыла, В.П. Лемцюгова, А.М. Прышчэпчык, М.М. Карсакова, А.М. Катонава, Я.М. Адамовіч, Я.Н. Рапановіч і інш. Асабліва паўплывалі ў гэты перыяд на развіццё тапанімікі ў нашай краіне працы М.В. Бірылы, В.А. Жучкевіча і В.П. Лемцюговай, у якіх яскрава адбілася тэндэнцыя высветліць не толькі ўласна моўныя, а і знешнія, гісторыка-геаграфічныя і сацыяльна-эканамічныя прычыны ўзнікнення таго ці іншага тапанімічнага тыпу, матывы выбару ўтваральных асноў. Галоўнымі напрамкамі тапанімічных пошукаў былі айканімія, гідранімія і мікратапанімія.*

*Мэта даследавання заключаецца ў вызначэнні сучаснага стану беларускай тапанімікі.*

***Матэрыял і метады.** У працы выкарыстаны апісальны, параўнальна-супастаўляльны метады і элементы колькасных падлікаў.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** У артыкуле характарызуецца фактычны стан сучаснай беларускай тапанімікі, якая ў адзначаны перыяд перасякаецца з такімі галінамі гуманітарных ведаў, як этналогія, сацыялінгвістыка, этнаграфія, лінгвакультуралогія, кагнітыўная лінгвістыка, прагматыка, міфалогія, гісторыя, фалькларыстыка, паэтыка; аналізуюцца падыходы да даследавання розных разрадаў тапонімаў.*

***Заключэнне.** Такім чынам, што галоўнымі прыкметамі развіцця тапанімікі на пачатку XXI стагоддзя з’яўляюцца пошук новых даследчых аспектаў, асваенне “белых плям” тапанімічнай прасторы, распрацоўка агульных пытанняў тэорыі оніма (тапоніма), паглыбленае вывучэнне класічных раздзелаў.*

***Ключавыя словы:** адтапанімны дэрыват, айконім, віконім, гелонім, тапонім, урбанонім, эклезіонім.*

*(Ученые записки. – 2015. – Том 20. – С. 147–158)*

# Contemporary State of Belarusian Toponymy

**Mezenka G.M.**
***Educational Establishment «Vitebsk State P.M. Masherov University», Vitebsk***

*As is known «scientific period of toponymy, as well as that of onomastics in general, in Belarus started in the late XIXth century». First linguistic researches of Belarusian toponymy appeared in the 1890s. The sources of toponymy in Belarus were created by such outstanding researchers as A.A. Kachubinski, Yu.Yu. Trusman, Ya.F. Karski [1]. Beginning of the systematic study of toponymy in Belarus is connected with the years of 1946–1947 (works by M.Ya. Grinblat, P.P. Shuba, V.A. Zhuchkevich, L.A. Akalovich are worth mentioning).*

*Considerable activization of toponymic researches is pointed out in 1960–1980s and is connected with the activity of such outstanding Belarusian toponymy scholars as M.V. Byryla, V.P. Lemtsyugova, A.M. Pryshchepchik, M.M. Karsakova, A.M. Katonava, Ya.M. Adamovich, Ya.N. Rapanovich and others. Works by M.V. Byryla, V.A. Zhuchkevich and V.P. Lemtsyugova influenced the development of toponymy in the country to the greatest extent. They clearly reflect the tendency to identify not only language but also outer, historical and geographic as well as social and economic reasons for the emergence of this or that toponymy type, choise motifs of fundamental bases. Main directions of toponymic searches were aikonymy, hydronymy and microtoponymy.*

*The purpose of the study is to determine the present state of Belarusian place names.*

***Material and methods.** The study used descriptive, comparative methods and elements of quantitative calculations.*

***Findings and their discussion.** The article characterizes the actual state of the contemporary Belarusian toponymy, in which the specified period overlaps with such fields of knowledge as anthropology, social linguistics, ethnography, linguistic culture studies, cognitive linguistics, pragmatics, mythology, history, folklore, poetry; analyzes approaches to the study of various groups of name.*

***Conclusion.** It is pointed out that the main characteristics of toponymy development in the early twenty-first century are the search for new research issues, the development of «white spots» in toponymic space, development of the general toponym theory, advanced study of classical sections.*

***Key words:** adtapanymny derivatives, aikonym, vikonym, gelonym, toponym, urbanonym, eclezionym.*

*(Scientific notes. – 2015. – Vol. 20. – P. 147–158)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* mezenka1@yandex.ru – **Г.М. Мезенка**

Як вядома, "навуковы перыяд тапанімікі, як і анамастыкі ўвогуле, у Беларусі пачаўся напрыканцы XIX ст." [2, с. 73]. Першыя лінгвістычныя даследаванні беларускай тапанімікі з'явіліся ў 1890-х гг. Ля вытокаў тапанімікі ў Беларусі стаяць такія вядомыя даследчыкі, як А.А. Качубінскі, Ю.Ю. Трусман, Я.Ф. Карскі [1]. З 1946–1947 гадамі звязваюць пачатак сістэматычнага вывучэння тапаніміі Беларусі (прыгадаем працы М.Я. Грынблата, П.П. Шубы, В.А. Жучкевіча, Л.А. Акаловіча).

Значная актывізацыя тапанімічных даследаванняў адзначаецца ў 1960–1980-х гг. і звязана яна з дзейнасцю такіх выдатных беларускіх тапаністаў, як М.В. Бірыла, В.П. Лемцюгова, А.М. Прышчэпчык, М.М. Карсакова, А.М. Катонава, Я.М. Адамовіч, Я.Н. Рапановіч і інш. Асабліва паўплывалі ў гэты перыяд на развіццё тапанімікі ў нашай краіне працы М.В. Бірылы, В.А. Жучкевіча і В.П. Лемцюговай, у якіх яскрава адбілася тэндэнцыя высветліць не толькі ўласна моўныя, а і знешнія, гісторыка-геаграфічныя і сацыяльна-эканамічныя прычыны ўзнікнення таго ці іншага тапанімічнага тыпу, матывы выбару ўтваральных асноў. Галоўнымі напрамкамі тапанімічных пошукаў былі айканімія, гідранімія і мікратапанімія.

У 1990-я гг. працягвае расці інтэнсіўнасць тапанімічных даследаванняў, павялічваецца кола вучоных, у навуковы зварот трапляюць тапанімныя адзінкі, якія раней не выступалі аб'ектам для аналізу, пашыраецца геаграфія навуковых устаноў, у якіх займаюцца вывучэннем тапонімаў. Так, калі раней галоўныя "тапанімічныя сілы" былі сканцэнтраваны ў асноўным у Інстытуце мовазнаўства імя Я. Коласа Акадэміі навук і ў БДУ, то цяпер тапанімны матэрыял разглядаецца таксама ў працах навукоўцаў з Гомеля, Віцебска, Мазыра, Брэста. Вядучай навуковай парадыгмай застаецца структурна-семантычная (нават болей структурная).

Мэта нашага даследавання заключаецца ў вызначэнні сучаснага стану беларускай тапанімікі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужылі публікацыі беларускіх даследчыкаў, прысвечаныя пытанням тапанімікі. У працы выкарыстаны апісальны, параўнальна-супастаўляльны метады і элементы колькасных падлікаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Нельга не пагадзіцца з думкай В.П. Лемцюговай, што ў пачатку XXI ст. беларуская анамастыка і тапаніміка як яе частка "пераходзіць на прынцыпова новы ўзровень развіцця, фарміруецца як самастойная навука са сваім аб'ектам, метадамі і прыёмамі даследавання" [3, с. 112]. Яна перасякаецца з такімі галінамі гуманітарных ведаў, як этналогія, сацыялінгвістыка, этнаграфія, лінгвакультуралогія, кагнітыўная лінгвістыка, прагматыка, міфалогія, гісторыя, фалькларыстыка, паэтыка.

Самы пачатак XXI ст. азнаменаваны пераходам на новую – антрапацэнтрычную парадыгму.

У сувязі з вялікімі зменамі, што адбыліся ў тапаніміі краіны з-за знікнення пэўнай колькасці паселішчаў і іх назваў, вялікай колькасці перайменаванняў, і састарэласцю слоўнікаў назваў населеных пунктаў, выдадзеных у 1970–1980-х гг. Я.Н. Рапановічам, вялікай з'явай не толькі ў беларускай, а і ў славянскай тапалексікаграфіі стала выданне нарматыўных даведнікаў па ўсіх абласцях краіны "Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь" [4]. Падрыхтаваны яны калектывамі аўтараў пад кіраўніцтвам доктара філалагічных навук, старшыні Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі В.П. Лемцюговай, зацверджаны Дзяржаўным камітэтам па маёмасці Рэспублікі Беларусь у якасці нарматыўнага выдання, прызначанага для выкарыстання рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, юрыдычнымі і фізічнымі асобамі Рэспублікі Беларусь. Пры шырокім удзеле грамадскасці Рэспублікі Беларусь – супрацоўнікаў краязнаўчых музеяў, работнікаў сельскіх саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў, школьных настаўнікаў, выкладчыкаў ВНУ і студэнтаў – па крупінках збіралася інфармацыя, якая лягла ў аснову такіх прадстаўнічых дзяржаўных дакументаў. Важна, што нарматыўныя даведнікі ўключаюць усе наяўныя на час выдання назвы населеных пунктаў абласцей у межах адміністрацыйна-тэрытарыяльных падраздзяленняў (раён, пасялковы, сельскі савет). Адрознівае ад папярэдніх слоўнікаў даведнікі і тое, што назвы падаюцца беларускай кірыліцай, лацінкай і рускай графікай. Паслядоўна ў беларускамоўнай частцы ва ўсіх назвах паказаны націск, граматычны род, множны

лік, прыводзяцца парадыгмы скланення, варыянты рэестравых назваў і страчаныя назвы. Немалаважна і тое, што суправаджаюцца яны алфавітнымі паказальнікамі назваў населеных пунктаў у трох графічных варыянтах. Пры падрыхтоўцы даведнікаў выкарыстоўваліся не толькі паказанні сучасных, а і гістарычных пісьмовых крыніц, матэрыялы, сабраныя ў палявых умовах.

Пэўным вынікам інтэнсіфікацыі даследаванняў і асновай далейшага развіцця тапанімікі і анамастыкі ўвогуле стала лексікаграфічная інвентарызацыя тапонімаў; павялічылася колькасць слоўнікаў, пашырыўся іх рэпертуар і сфера ахопу матэрыялу. Так, у 2000 г. з’яўляецца “Анамастычны слоўнік Магілёўшчыны”, складзены В.І. Рагаўцовым і С.Я. Кечык [5]; у 2001 г. “Слоўнік тапонімаў і адтапанімічных дэрыватаў у арэале заходнепалескіх гаворак” выдае З.М. Заіка [6]; у 2003 г. выходзяць з друку тры слоўнікі – два па айканіміі Гомельшчыны (Н.А. Багамольнікавай і А.А. Станкевіч “Айканімія Гомельшчыны” [7] і А.Ф. Рогалева “Родныя назвы: Тапанімічны слоўнік Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці” [8]), адзін па ўрбананіміі Беларусі [2]. 2004 г. стаў годам выдання “Слоўніка мікратапонімаў Магілёўшчыны” (склад. С.В. Клімуць, В.І. Рагаўцоў, С.У. Шакура) [9]; 2005 г. – “Слоўніка адтапанімных дэрыватаў Віцебшчыны” У.М. Генкіна [10], у гэтым жа годзе перавыдадзены “Слоўнік беларускіх мясцовых геаграфічных тэрмінаў: Тапаграфія. Гідралогія” І.Я. Яшкіна [11]; 2008 г. – слоўніка назваў вуліц Віцебшчыны [12]. У 2013 г. друкуюцца “Слоўнік назваў перайменаваных паселішчаў Беларусі” А.В. Кавалёвай [13] і “Тапанімічны слоўнік Лагойскага раёна Мінскай вобласці (назвы населеных пунктаў)” А.Ф. Рогалева [14].

Практычная работа па складанні слоўнікаў патрабуе тэарэтычнага асэнсавання. Таму зусім заканамерна, што ў 2012 г. з’яўляецца манаграфія С.У. Шахоўскай “Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця” [15], якая ўяўляе сабой першы нацыянальны вопыт тэарэтычнага аналізу беларускіх тапанімічных і антрапанімічных слоўнікаў розных тыпаў, акрэслівае межы і спецыфічныя рысы асноўных перыядаў у развіцці анамастычнай лексікаграфіі, вылучае асаблівасці структуры слоўнікаў, прадстаўляе разгалінаваную іх тыпалогію. Аўтар адзначае, што “з часу ўзнікнення традыцыі мэтанакіраванага лексікаграфавання анамастычнага матэрыялу на Беларусі ў другой палове XX ст. была даследавана і кадыфікавана дастаткова вялікая частка беларускага анамастыкону. Тым не менш, адзначаецца неаднолькавы ўзровень тэарэтычнай даследаванасці і лексікаграфічнай прадстаўленасці розных тыпаў беларускіх онімаў” [15, с. 177]. У пачатку XXI ст. існуе выразная дыспрапорцыя паміж шырокай прадстаўленасцю энцыклапедычнага апісання водных аб’ектаў краіны і адсутнасцю мовазнаўчай лексікаграфічнай інвентарызацыі адпаведных анамастычных адзінак. Адкрытасць рада слоўнікавай тыпалогіі будзе садзейнічаць узнікненню новых тыпаў лексікаграфічных работ, што прадставяць новыя весткі для тэорыі тапанімічнай лексікаграфіі.

Пытанням прыкладной лексікаграфіі прысвечаны таксама шэраг артыкулаў У.М. Генкіна [16], І.Л. Капылова [17], Г.М. Мезенка [18], А.А. Станкевіч [19] і інш.

Сярод галоўных прыкмет развіцця тапанімікі на пачатку XXI ст. неабходна назваць 1) пошук новых даследчых аспектаў, 2) асваенне “белых плям” тапанімічнай прасторы, 3) распрацоўку агульных пытанняў тэорыі тапоніма, 4) паглыбленае вывучэнне класічных яе раздзелаў.

Адным з новых аспектаў, які актыўна распрацоўваецца беларускімі тапаністамі апошнім часам, з’яўляецца лінгвакультуралагічны. Мова як люстэрка народнай культуры, як крыніца гісторыі народа і яго духу даўно ўспрымалася так і выкарыстоўвалася прадстаўнікамі розных навук – этнолагамі, культуролагамі, міфолагамі і, вядома, лінгвістамі. Склаўшыся на мяжы XX і XXI стст., лінгвакультуралогія якраз і мае на мэце разгляд анамастычнага, і ў тым ліку тапанімнага, матэрыялу ў аспекце ўзаемадзеяння мовы і культуры: у тапанімнай карціне свету ўвасабляецца характар культуры кожнага этнасу і кожнага чалавека. Актуальнасць такіх даследаванняў бясспрэчная, яна абумоўліваецца, па-першае, патрабаваннямі развіцця сучаснай тапанімікі, якая назапасіла багаты эмпірычны і тэарэтычны матэрыял, які мае патрэбу ва ўсебаковым вывучэнні яго з антрапацэнтрычных пазіцый; па-другое, важнасцю захоўвання культурнай спадчыны

народа, якая замацавана ў назвах паселішчаў, колькасць якіх у апошнія дзесяцігоддзі няўхільна скарачаецца; па-трэцяе, неабходнасцю апісання спецыфікі тапанімікону як асобнага фрагмента моўнай карціны свету, пазнанне якой – найважнейшая задача лінгвакультуралагічных даследаванняў; па-чацвёртае, практычнымі патрэбамі адукацыі, менавіта неабходнасцю выкарыстання ў адукацыйным працэсе сведчанняў аб гісторыка-культурным патэнцыяле назваў населеных пунктаў Беларусі.

Так, у артыкулах Ю.А. Гурскай 2000 г. разгледжаны онім *Мінск* у якасці аднаго з ключавых канцэптаў беларускай мовы і культуры ХХ стагоддзя [20].

У.М. Генкін апісвае айконімы віцебска-смаленскага памежжа як лінгвакультуралагічную з’яву [21].

Узаемаадносіны кодаў культуры і ўрбананіміі, своеасаблівасць айконімаў Беларусі, суадносных з катэгорыяй святасці, высвятляе ў шэрагу артыкулаў Г.М. Мезенка [22].

Асаблівасці аб’ектывацыі антрапаморфнага, духоўнага, ландшафтнага, тапаморфнага, фларыстычнага, эмацыянальна-характаралагічнага кодаў у віканіміі Беларусі, кампаненты культуры адантрапанімных унутрысельскіх назваў Беларускага Паазер’я вывучаны М.Л. Дарафеенка [23].

У даследаванні Т.Ю. Васільевай структураваны ментальны вобраз месца пасялення на матэрыяле назваў населеных пунктаў Беларускага Паазер’я; вылучаны семантычныя палі айконімаў, што адлюстроўваюць асноўныя спосабы ўспрымання месца пасялення носьбітамі тапонімаў; вызначаны аб’ём семантычных палёў, устаноўлены семантычныя мадэлі, што ўваходзяць у іх склад; комплекс кодаў культуры, рэалізацыі якіх служыць айканімія Беларускага Паазер’я; апісаны групы назваў населеных пунктаў, якія эксплікуюць інфармацыю канцэптуальных кодаў культуры; ахарактарызаваны асаблівасці аб’ектывацыі кодаў культуры ў айканіміі даследаванага рэгіёна; выяўлены элементы традыцыйнай духоўнай культуры беларускага народа, што знайшлі адлюстраванне ў сістэме назваў населеных пунктаў Беларускага Паазер’я.

Вельмі цесна з лінгвакультуралагічным звязаны этналінгвістычны аспект даследаванняў, які таксама скіраваны на вывучэнне ўзаемасувязі мовы і нацыянальнай культуры. Этналінгвістыка (ад грэч. ἔθνος – народ + лінгвістыка), або лінгвістычная антрапалогія, – “лінгвістыка, якая вывучае адносіны паміж мовай і народам і ўзаемадзеянне лінгвістычных і этнічных фактараў у функцыяніраванні і развіцці мовы” [24]. Пры гэтым цэнтральнымі для этналінгвістыкі з’яўляюцца наступныя дзве цесна звязаныя праблемы – кагнітыўная (якім чынам, з дапамогай якіх сродкаў і ў якой форме знаходзяць адлюстраванне культурныя (бытавыя, рэлігійныя, сацыяльныя і інш.) уяўленні народа, які гаворыць на гэтай мове, аб навакольным асяроддзі і аб месцы чалавека ў гэтым свеце) і камунікатыўная (якія формы і сродкі зносін – у першую чаргу, моўных зносін – з’яўляюцца спецыфічнымі для пэўнай этнічнай або сацыяльнай групы).

Распрацоўка этналінгвістычнай праблематыкі, грунтоўна прадстаўленая ў даследаваннях расійскіх анамастаў (А.Л. Беразовіч, М.Э. Рут, А.К. Мацвеева, А.Ф. Каўлакас), у беларускай тапаніміцы толькі пачынаецца. Адной з першых работ манаграфічнага плану стала даследаванне Т.М. Аліферчык “Тапанімія Заходняга Палесся: этналінгвістычны аспект” [25], у якім аўтар апрацаваў больш за 1000 айконімаў і мікратапонімаў, у найбольшай ступені адлюстраваўшых асаблівасці ўспрыняцця чалавекам навакольнага асяроддзя і выявіўшых тыя асаблівасці і заканамернасці, што пакладзены ў аснову старажытнага светабачання. З дапамогай семантыка-матывацыйнага аналізу і неабходнай этналінгвістычнай інтэрпрэтацыі онімаў даследчыца ўстанавіла матывавальныя асновы і рэканструявала матывацыйныя адносіны апелятываў і тапонімаў, выявіла базавыя заканамернасці семантычнай арганізацыі заходнепалескага тапанімікону, вызначыла асноўныя прынцыпы тапанімнай намінацыі, а гэта значыць рэканструявала ландшафтную мадэль тапанімічнай прасторы Заходняга Палесся, якая характарызуецца такімі рысамі, як наіўны фундамент (навакольнае асяроддзе) і гаспадарчая абумоўленасць прасторавых адносін.

Адзначаючы перспектыўнасць падобных даследаванняў у іншых этнічнабеларускіх рэгіёнах, Т.М. Аліферчык перакананa, што яны дазволяць правесці супастаўляльны аналіз і выдзяленне прыярытэтных аб’ектаў у ландшафтнай тапанімічнай мадэлі прасторы розных беларускіх тэрыторый.

Сярод артыкулаў вылучым даследаванне У.М. Генкіна “Механізмы «шыфравання» этнакультурнай інфармацыі ў тапаніміконе” [26] і нашу “Рэпрэзентацыю этнакультурнай інфармацыі ва ўрбананіміі і віканіміі” [27], дзе ў адным з вынікаў падкрэсліваецца, што ў культуры беларусаў адзначаны розныя арыентацыйныя перавагі, аднак ва ўрбананімнай і віканімнай “прасторы” народнай культуры фіксуецца лідарства не паўночнага, як у рускіх, а паўднёвага, цёплага боку.

Калі гаварыць пра такую прыкмету развіцця тапанімікі на пачатку XXI ст., як асваенне “белых плям” тапанімічнай прасторы, тых разрадаў тапонімаў, якія раней не траплялі ў поле зроку тапаністаў, то, бадай, як найбольш заўважныя сярод іх неабходна назваць наступныя.

Даследаванне кагнітыўна-анамасіялагічных асаблівасцей гелонімаў, вызначэнне структуры, семантычных мадэлей і тыпаў, выяўленне спосабаў і сродкаў намінацыі балот Беларусі праводзіў А.І. Копач [28].

Вывучэннем структурных, намінацыйных і лінгвагеаграфічных асаблівасцей эклезіяніміі Беларусі займалася В.А. Барысевіч. Былі выяўлены структурныя тыпы і мадэлі, спосабы граматычнага выражэння назваў культавых збудаванняў; вызначаны матывы намінацыі і вылучаны тэматычныя групы эклезіонімаў розных канфесій; устаноўлена спецыфіка распаўсюджання назваў месцаў здзяйснення абраду розных канфесій на тэрыторыі Беларусі; адшуканы лінгвакультуралагічныя асаблівасці эклезіонімаў Беларусі [29].

Інтэнсіўна распрацоўваецца тэорыя віканіміі Беларусі. У прыватнасці, М.Л. Дарафеенка ў намінацыйным, лінгвакультуралагічным, структурна-семантычным аспектах праанalізавала віканімію Беларусі. Акрамя таго, у некалькіх артыкулах на матэрыяле найменняў унутрысельскіх лінейных аб’ектаў знайшло адлюстраванне лінгвагеаграфічнае прадстаўленне віконімаў краіны [30].

Хартэнсіонім як від тапоніма, яго статус, тыпы і мадэлі, асаблівасці функцыянавання даследавала Г.М. Мезенка [31].

Высвятленнем асаблівасцей назваў чыгуначных станцый займалася А.М. Анісім [32].

У параўнальна-супастаўляльным плане даследавалі назвы балот Беларусі і ЗША [28], беларускую і кітайскую ўрбананімію [33], айканімію і ўрбананімію Віцебшчыны і Смаленшчыны Т.Ю. Васільева [34], У.М. Генкін [35], Г.М. Мезенка [36–37], агульнае і адрознае ў намінацыі вуліц Мінска, Кіева, Масквы [38].

Гендарны аспект даследавання на матэрыяле віканіміі і ўрбананіміі Беларусі закрануты толькі ў асобных публікацыях М.Л. Дарафеенка [39] і Г.М. Мезенка [40].

Заўважна інтэнсіфікаваліся даследаванні ў галіне літаратурнай тапанімікі. Тут побач з працамі такіх шырока вядомых беларускіх анамастаў, як В.В. Шур, І.Э. Ратнікава, В.А. Ляшчынская, Г.М. Дзеравяга, сустракаем публікацыі новых для беларускай тапанімікі аўтараў (гл.: М.Г. Сітнікава, Т.П. Слесарава, Трашчынская-Сцяпушына [41]).

Вывучэнню адонімных адзінак, што функцыянуюць на тэрыторыі Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцей, прысвечаны даследаванні У.М. Генкіна, З.М. Заікі, З.У. Шведавай [6; 10; 42].

Што да распрацоўкі агульных пытанняў тэорыі оніма (тапоніма), то ў аналізуемы перыяд на першы план выйшлі пытанні статусу адзінак асобных разрадаў тапонімаў (В.А. Барысевіч [43], М.Л. Дарафеенка), праблем даследавання этнатапаніміі (Т.М. Аліферчык [44], Т.Ю. Васільева, Г.М. Мезенка), рэалізацыі кодаў культуры ў айканіміі, віканіміі і ўрбананіміі (Т.Ю. Васільева, М.Л. Дарафеенка, Г.М. Мезенка), сучасныя падыходы да вывучэння семантыкі тапонімаў (Т.Ю. Васільева), суадносін тапанімікону і праблем міжкультурнай камунікацыі (У.М. Генкін), лексікаграфавання перыферыйнага тапанімнага матэрыялу (У.М. Генкін), кагнітыўныя асновы граматыкі тапоніма (А.І. Копач), методыкі кагнітыўна-анамасіялагічнага даследавання тапонімаў (А.І. Копач), суадносін тапанімікі і маўленчай дзейнасці (А.І. Копач), сістэмных адносін у сферы тапанімічных метафар (І.Э. Ратнікава) і інш.

І яшчэ адной прыкметай адрозніваецца развіццё тапанімікі на пачатку XXI ст. – паглыбленым вывучэннем класічных яе раздзелаў і аспектаў.

Актыўна распрацоўваўся гісторыка-этымалагічны аспект даследавання гідраніміі і айканіміі. Так, работы Р.М. Казловай і яе вучняў, як і раней, былі арыентаваны “на ўстанаўленне генетычных сувязей з іншымі онімамі, на рэканструкцыю анамастычных мікрасістэм, без чаго нельга разабрацца ў тых моўных працэсах, якія былі ўласцівы адзінкам у іх гісторыі, і ў тых рэзультатах моўных працэсаў, якія адбіліся ў сучасных назвах;

на стратыфікацыю праславянскага пласта гідронімаў”. Другі аспект даследавання – рэканструкцыя прагідронімаў (і іншых праонімаў) пэўнай словаўтваральнай мадэлі [45, с. 3–4; 46].

Гісторыка-этымалагічным аналізам айконімаў і гідронімаў займаліся Н.А. Багамольнікава [47] і А.В. Грамыка [48]. Гісторык Ю. Гардзееў правёў аналіз эвалюцыі тапанімікону старажытнай Гародні на храналагічным адрэзку XII–XVIII стст., разгледзеў пытанне паходжання ўласных імён Гародні і ракі Нёман, гісторыю шмат якіх унутрыгарадскіх назваў [49]. І.А. Гапоненка вывучала харонімы ў беларускамоўным кантэксце пачатку XX стагоддзя [50]. Беларуска-літоўскія летапісы як крыніцу тапанімнага матэрыялу даследавала В.П. Галубовіч [51]. Айконімы на матэрыяле старабеларускіх помнікаў дзелавой пісьменнасці XV–XVIII стст. аналізаваў І.Л. Капылоў [52]. Старажытную беларускую тапанімію вывучала таксама В.У. Міцкевіч [53]. Старонкі старажытнай гісторыі, фарміраванне вуліц, мясцовыя тайны розных гарадоў Гомельшчыны прааналізаваны і апісаны ў шматлікіх работах А.Ф. Рогалева [54–55].

Пачатак XXI ст. азнаменаваны паглыбленым вывучэннем рэгіянальнай праблематыкі. З усіх рэгіёнаў Беларусі найбольш распрацаванымі ў тапанімічных адносінах аказаліся Віцебскі (гл. даследаванні В.А. Барысевіч, Т.Ю. Васільевай, У.М. Генкіна, М.Л. Дарафеенка, Г.М. Дзеравягі, І.Я. Кураш, Г.М. Мезенка, К.А. Сасноўскай, Т.І. Сінкевіч), Гомельскі (Н.А. Багамольнікавай, Т.М. Багаедавай, С.М. Байковай, А.А. Івановай, А.В. Кавалёвай, Р.М. Казловай, З.У. Шведавай), Мінскі (Ю.А. Гурскай, А.І. Копача, В.П. Лемцюговай, І.Л. Капылова, А.У. Кісліцынай, Н.А. Радзіваноўскай, С.У. Шахоўскай) і Брэсцкі (У.У. Барысюк, З.М. Заіка, Л.В. Леванцэвіч, Н.Р. Якубук), часткова Гродзенскі (В.М. Емельяновіч, В.Т. Валюк, С.А. Каралевіч) і Магілёўскі (С.В. Клімуць, В.І. Рагаўцоў, С.У. Шакура, А.М. Шубадзёрава).

Яшчэ адзін аспект, які патрабаваў тэрміновага разгляду, – нарматыўны, з дапамогай якога вырашаюцца пытанні стандартызацыі назваў, перадачы найменняў з адной мовы на іншую.

Праблемы нармалізацыі і кадыфікацыі адтапанімных дэрыватаў уздымаў у 2002 г. У.М. Генкін [56]. Ён жа ў 2006 г. ставіў пытанне пра рускамоўную перадачу беларускіх адтапанімных дэрыватаў [57]. Асаблівасці перадачы іншамоўных геаграфічных назваў па-беларуску даследавала І.А. Гапоненка [58]. Маштаб праблемы перадачы беларускіх онімаў графічнымі сродкамі лацінскага алфавіта вызначаў П.М. Давідоўскі [59].

Нормы ў анамастыцы, у прыватнасці ўнармаванне назваў вуліц, турбавалі Н.А. Багамольнікаву [60] і І.Л. Капылова, які аналізаваў таксама нарматыўна-прававую базу міжмоўнай перадачы беларускай, рускай, польскай тапаніміі [61].

Пытанні стандартызацыі назваў чыгуначных станцый цікавілі А.М. Анісім [32]. Праблему стандартызацыі нацыянальных геаграфічных назваў у кантэксце паўночнаамерыканскага вопыту і практыку Беларусі па стандартызацыі геаграфічных назваў у кантэксце сусветнага вопыту аналізаваў А.І. Копач [62].

**Заключэнне.** Такім чынам, фактычны стан сучаснай айчыннай тапанімікі характарызуецца разнастайнасцю падыходаў да аналізу розных разрадаў тапонімаў. Найбольш актыўна ў першае дзесяцігоддзе XXI ст. беларускія даследчыкі працавалі ў арэальным, гісторыка-этымалагічным, лінгвакультуралагічным, этналінгвістычным, супастаўляльным і нарматыўным аспектах.

Можна выказаць меркаванне, што культурна-гістарычная каштоўнасць тапонімаў і павелічэнне ролі асобы ў грамадстве актуалізуюць выкарыстанне кагнітыўнага, гендарнага, прагматычнага і іншых аспектаў тэорыі маўленчай камунікацыі, пакуль толькі адзінкава задзейнічаных пры аналізе тапанімнага матэрыялу. Праблема вывучэння кожнага славянскага рэгіёна ў этымалагічным і храналагічным аспектах будзе і надалей заставацца актуальнай. Прадыктаваная інфармацыйным патэнцыялам назваў паселішчаў, вуліц, плошчаў, распрацоўка праблем тапанімічнай рэгіяналістыкі застанецца адной з перспектыўных галін лінгвістыкі.

Разрады тапонімаў вывучаны нераўнамерна. Пры значнай цікавасці тапаністаў да розных відаў тэронімаў (айконімаў, урбанонімаў, харонімаў, віконімаў, хартэнсіонімаў, эклезіонімаў) неабходна канстатаваць, што, нягледзячы на распрацоўку такіх відаў гідронімаў, як лімнонімы і гелонімы, сучасны стан уласна патаманіміі (сукупнасці назваў рэк) пакуль застаецца па-за ўвагай даследчыкаў.

## Літаратура

1. Кочубинский, А.А. Территория доисторической Литвы / А.А. Кочубинский // Журнал М-ва народного просвещения. – 1897. – Кн. 1, январь; Трусман, Ю.Ю. Этимология местных названий Витебской губернии / Ю.Ю. Трусман. – Ревель, 1897; Карский, Е.Ф. Белорусы. Введение в изучение языка и народной словесности / Е.Ф. Карский. – Вильно, 1904.
2. Мезенко, А.М. Имя внутригородского объекта в истории: об урбанонимах Беларуси XIV – начала XX в. / А.М. Мезенко. – Минск: Выш. шк., 2003. – 301 с.
3. Лемцюгова, В.П. Беларуская анамастыка. Дасягненні і перспектывы / В.П. Лемцюгова // Актуальные вопросы славянской ономастики: материалы II Междунар. науч. конф. «Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах» / отв. ред. Р.М. Козлова. – Гомель, 2004. – С. 107–115.
4. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Брэсц. вобл.: нармат. давед. / пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2010. – 319 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Віцеб. вобл.: нармат. давед. / пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2009. – 669 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Гомел. вобл.: нармат. давед. / Н.А. Багамольнікава [і інш.]; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2006. – 382 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Гродзен. вобл.: нармат. давед. / І.А. Гапоненка, В.П. Лемцюгова, Л.Л. Янушкевіч і інш.; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2004. – 471 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Магіл. вобл.: нармат. давед. / І.А. Гапоненка [і інш.]; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2007. – 406 с.; Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Мін. вобл.: нармат. давед. / І.А. Гапоненка, І.Л. Капылоў, В.П. Лемцюгова і інш.; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск: Тэхналогія, 2003. – 605 с.
5. Рагаўцоў, В.І. Анамастычны слоўнік Магілёўшчыны / В.І. Рагаўцоў, С.Я. Кечык. – Магілёў: МДУ А.А. Куляшова, 2000. – 166 с.
6. Заіка, З.М. Слоўнік тапонімаў і адтапанімічных дэрыватаў у арэале заходнепалескіх гаворак / З.М. Заіка. – Брэст, 2001. – 68 с.
7. Багамольнікава, Н.А. Айканімія Гомельшчыны: слоўнік / Н.А. Багамольнікава, А.А. Станкевіч; навук. рэд. В.П. Лемцюгова. – Гомель: УА “ГДУ імя Ф. Скарыны”, 2003. – 392 с.
8. Рогалев, А.Ф. Родные названия: Топонимический словарь Ветковского района Гомельской области / А.Ф. Рогалев. – Гомель: Обл. общество «Книга», 2003. – 168 с.
9. Клімуць, С.В. Слоўнік мікратапонімаў Магілёўшчыны / склад. С.В. Клімуць, В.І. Рагаўцоў, С.У. Шакура. – Магілёў, 2004. – 206 с.
10. Генкін, У.М. Слоўнік адтапанімных дэрыватаў Віцебшчыны / У.М. Генкін. – Віцебск: Выдавецтва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2005. – 235 с.
11. Яшкін, І.Я. Слоўнік беларускіх мясцовых геаграфічных тэрмінаў: Тапаграфія. Гідралогія / І.Я. Яшкін. – Мінск: Бел. навука, 2005. – 808 с.
12. Мезенка, Г.М. Віцебшчына ў назвах вуліц: манаграфія: у 2 ч. / Г.М. Мезенка. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2008. – Ч. 1. – 363 с.; Ч. 2. – 254 с.
13. Кавалёва, А.В. Слоўнік назваў перайменаваных паселішчаў Беларусі / А.В. Кавалёва; пад рэд. В.В. Шура. – Мінск: Права і эканоміка, 2013. – 140 с.
